**МЕМАРАНДУМ АБ УЗАЕМАДЗЕЯННІ І РАЗМЕЖАВАННІ АДКАЗНАСЦІ**

**“ 4 , Сакавіка 2026 г.”**

паміж Каардынацыйнай радай Беларусі, Выбарчай камісіяй і Правайдарам лічбавай платформы верыфікацыі і галасавання (далей — Мемарандум)

## 1. Бакі

**1.1.** Каардынацыйная рада Беларусі (далей — Рада) у асобе Спікера Арцема Брухана

**1.2.** Выбарчая камісія па выбарах у Каардынацыйную раду Беларусі (далей — Камісія) у асобе Старшыні Камісіі Алены Прыходзька.

**1.3.** Правайдар лічбавай платформы верыфікацыі і галасавання (далей — Правайдар) — у асобе Паўла Лібера, прадстаўніка праекта «Новая Беларусь» і модуля «Belarus ID».

**1.4.** Рада, Камісія і Правайдар разам — Бакі.

## 2. Мэта і статус

**2.1.** Мемарандум фіксуе ролі, межы адказнасці і парадак узаемадзеяння Бакоў у выбарчым працэсе, каб пазбегнуць неадназначнасцяў у пытаннях адказнасці, камунікацыі і тэхнічнай рэалізацыі галасавання.

**2.2.** Мемарандум не змяняе і не адмяняе Палажэнне аб выбарах у Каардынацыйную Раду і Статут.

**2.3.** Мемарандум дзейнічае як удакладненне і практычная рамка ў межах гэтых дакументаў.

**2.4.** Камісія дзейнічае незалежна і прымае рашэнні ў межах сваіх паўнамоцтваў, прадугледжаных Палажэннем.

**2.5.** Мемарандум мае рамкавы характар і не ўтварае дамову на аказанне паслуг/падраду. Асноўныя камерцыйныя і юрыдычныя ўмовы вызначаюцца і замацоўваюцца ў Service Agreement.

**2.6.** У выпадку супярэчнасцяў паміж Мемарандумам і ТЗ, прымяняюцца палажэнні Мемарандума, калі іншае наўпрост не ўстаноўлена ў дадатку/пагадненні, падпісаным усімі Бакамі.

**2.7.** Змены, якія ўплываюць на аб’ём работ, тэрміны, узровень рызыкі або кошт, уносяцца праз працэдуру змен, якая фіксуе новую ацэнку тэрмінаў/рэсурсаў/рызык.

## 3. Ролі і абавязкі

### 3.1. Рада:

**3.1.1.** забяспечвае арганізацыйна-тэхнічную і матэрыяльную падтрымку выбарчага працэсу, у тым ліку забеспячэнне трансляцый адкрытых пасяджэнняў Камісіі і размяшчэння матэрыялаў Камісіі, якія носяць публічны характар, на інфармацыйных рэсурсах Каардынацыйнай Рады (сайт, афіцыйныя каналы) для інфармавання пра выбарчы працэс.

**3.1.2.** адказвае за забеспячэнне фінансавымі рэсурсамі дзейнасці Правайдара;

**3.1.3.** гарантуе нязменнасць Палажэння аб выбарах падчас выбарчай кампаніі.

**3.1.4.** Каардынацыйная Рада забяспечвае пляцоўкі і распаўсюд матэрыялаў Камісіі (сайт/афіцыйныя каналы), а таксама тэхнічныя магчымасці для публікацыі паведамленняў

### 3.2. Камісія:

**3.2.1.** выконвае абавязкі, прадугледжаныя Палажэннем аб выбарах у Каардынацыйную раду, і прымае адпаведныя працэдурныя рашэнні;

**3.2.2.** распрацоўвае, зацвярджае і забяспечвае правілы і працэдуры ўдзелу ў выбарах выбарчых суб’ектаў (у адпаведнасці з Палажэннем аб выбарах);

**3.2.3.** Камісія з’яўляецца асноўным суб’ектам публічнай камунікацыі пра выбарчы працэс (правілы, тэрміны, рашэнні, вынікі, афіцыйныя тлумачэнні).

**3.2.4.** рэгіструе выбарчыя суб’екты,ажыццяўляе праверку пададзеных імі матэрыялаў, адмаўляе ў рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў;

**3.2.5.** разглядае скаргі і звароты, праводзіць пасяджэнні, прымае рашэнні, распрацоўвае нарматыўнае рэгуляванне выбарчага працэсу ў пытаннях, не ахопленых Палажэннем аб выбарах у Каардынацыйную раду;

**3.2.6.** перадае Радзе матэрыялы для публікацыі (пратаколы, рашэнні, паведамленні і іншыя прынятыя камісіяй дакументы);

**3.2.7.** распрацоўвае і ўзгадняе з Радай спіс неабходнага матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння для дзейнасці Камісіі;

**3.2.8.** фармулюе функцыянальныя патрабаванні да працэсаў верыфікацыі і галасавання на платформе (далей — *Тэхнічнае заданне, ТЗ*), у тым ліку зацвярджае правілы верыфікацыі выбаршчыка і перадае свае прапановы па ТЗ Правайдару да 28.02.2026;

**3.3. Правайдар:**

**3.3.1.** праводзіць аналіз рэалізуемасці ТЗ і па выніку дае пісьмовае пацвярджэнне рэалізуемасці або пералік неабходных удакладненняў/зменаў. У выпадку, калі асобныя патрабаванні ТЗ з'яўляюцца тэхнічна нерэалізуемымі, празмерна рызыкоўнымі або патрабуюць дадатковых рэсурсаў/часу, Бакі ўносяць змены ў ТЗ і/або графік.

**3.3.2.** узгадняе з Камісіяй ТЗ да 05 сакавіка 2026 года;

**3.3.3.** пасля ўзгаднення ТЗ і да завяршэння галасавання дзейнічае рэжым замарозкі істотных патрабаванняў. істотныя змены дапускаюцца толькі праз Change Request і могуць прывесці да пераносу тэрмінаў.

**3.3.4.** забяспечвае тэхнічную працу лічбавай платформы верыфікацыі і галасавання ў адпаведнасці з узгодненым Камісіяй ТЗ і ў вызначаныя ёй тэрміны;

**3.3.5.** нясе адказнасць за тэхнічную стабільнасць, даступнасць і інфармацыйную бяспеку платформы ў межах узгодненых у Тэхнічным заданні параметраў;

**3.3.6.** распрацоўвае і ўзгадняе з Камісіяй ўсе істотныя тэхнічныя змены, а таксама тэрмінова інфармуе Камісію і Раду ў выпадку ўзнікнення форс-мажорных абставінаў ці інцыдэнтаў;

**3.3.7.** правайдар не нясе адказнасці за рызыкі па-за зонай яго кантролю, у тым ліку: прымус/ціск на выбаршчыкаў, адключэнні інтэрнэту на баку правайдэраў сувязі, а таксама іншыя знешнія фактары, не выкліканыя дзеяннямі/бяздзеяннем Правайдара.

**3.3.8.** ажыццяўляе камунікацыю выключна па пытаннях тэхнічнай падтрымкі Платформы (інструкцыі, статус сэрвісу, тэхнічныя паведамленні) і не каментуе працэсуальныя рашэнні Камісіі.

**3.3.9.** забяспечвае тэхнічную магчымасць верыфікацыі і галасавання ў межах узгодненага ТЗ і не нясе адказнасці за ўзровень удзелу выбаршчыкаў (яўку), іх паводзіны, матывацыю, а таксама за вынікі інфармацыйнай кампаніі.

## 4. Даныя і бяспека

**4.1.** Бакі прызнаюць, што апрацоўка даных выбаршчыкаў ажыццяўляецца выключна для мэт верыфікацыі і забеспячэння галасавання ў межах выбарчага працэсу.

**4.2.** Ролі і прынцыповыя абавязкі па даных і бяспецы (катэгорыі даных, доступы, тэрміны захавання/выдалення, паведамленне пра інцыдэнты), а таксама дэталёвыя тэхнічныя параметры (інтэграцыі, метады, лагаванне, абмежаванні, SLA) замацоўваюцца ў ТЗ.

## 5. Заканчэнне дзейнасці Мемарандума

**5.1.1.** У выпадку невыканання ці несвоечасовага выканання адным з Бакоў абавязкаў, прадугледжаных Мемарандумам, адпаведна з Графікам правядзення выбараў (прыкладаецца да Мемарандума), кожны з іншых Бакоў можа прыпыніць далейшае выкананне сваіх абавязкаў да выпраўлення прычын, якія прывялі да гэтага.

**5.1.2.** У выпадку ўзнікнення форс-мажорных абставінаў кожны з Бакоў можа прыпыніць свой удзел у Мемарандуме.

**5.1.3.** Камісія ў адпаведнасці з прынятым ёй 17 лютага 2026 года Рашэннем "Аб зацвярджэнні Рэгламента працы Выбарчай камісіі па правядзенні выбараў у Каардынацыйную Раду IV склікання" можа прыняць матываванае рашэнне аб прыпыненні выбарчага працэсу або прызнанні выбараў несапраўднымі, калі ў выніку істотных і непапраўных парушэнняў, звязаных з бяспекай выбаршчыкаў, забеспячэннем таямніцы галасавання, незаконным умяшальніцтвам у дзейнасць Камісіі або матэрыяльна-тэхнічным

незабеспячэннем электаральнай кампаніі, становіцца немагчымым правядзенне свабодных і справядлівых выбараў, якія адлюстроўваюць сапраўднае волевыяўленне выбаршчыкаў.

**5.1.4.** Прыпыненне ўдзелу любога з Бакоў павінна адбывацца ў кантраляваным рэжыме і не ствараць дадатковых рызык для даных выбаршчыкаў: з выкананнем працэдур бяспечнага спынення/кансервацыі і абмежавання доступаў.

**5.1.5.** Дзейнасць Мемарандума скончваецца пасля выканання ўсімі Бакамі сваіх абавязкаў або ў выніку пагаднення ўсіх Бакоў аб скасаванні Мемарандума.

Спікер Каардынацыйнай Рады
Арцем Брухан





Старшыня Выбарчай камісіі Алена Прыходзька



Правайдар лічбавай платформы верыфікацыі і галасавання
Павел Лібер

Прыкладанне да Мемарандума

аб узаемаразуменні і размежаванні адказнасці

**ГРАФІК ПРАВЯДЗЕННЯ ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ**

1. 20 студзеня 2026 года прынящцё Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную Раду. Абвяшчэнне прыёма заявак на ўдзел у складзе Выбарчай камісіі (далей ВК).
2. 28 студзеня 2026 года абвяшчэнне кандыдатаў на ўдзел у складзе Выбарчай камісіі. Правядзенне пасяджэння па разгляду кандыдатаў на ўдзел у складзе Выбарчай камісіі.
3. 30 студзеня 2026 года зацвярджэнне складу сябраў Выбарчай камісіі.
4. 06 лютага 2026 года падпісанне сябрамі Выбарчай камісіі Устаноўчай дамовы.
5. 17 лютага правядзенне першага адкрытага пасяджэння Выбарчай камісіі. Прынящце Рэгламента працы ВК, выбары Старшыні ВК.
6. 4 сакавіка 2026 года падпісанне трохбаковага Мемарандума аб узаемадзеянні і размежаванні адказнасці.
7. 5 сакавіка 2026 Выбарчая камісія перадае Правайдэру зацверджанае Тэхнічнае заданне.
8. 6 сакавіка Выбарчая каміссія абвяшчэе сродкі правядзення выбараў і датаў галасавання.
9. 10-31 сакавіка 2026 года падача дакументаў аб рэгістрацыі Выбарчага суб'екта. У гэты ж перыяд ажыццяўляецца рэгістрацыя Выбарчых суб’ектаў, прымаюцца адпаведныя рашэнні Камісіі аб рэгістрацыі Выбарчага суб’екта ці аб адмове ў рэгістрацыі Выбарчага суб’екта.
10. 1-3 красавіка 2026 года Выбарчай камісія зацвярджае поўны пералік зарэгістраваных Выбарчых суб’ектаў і тых Выбарчых суб’ектаў, якім было адмоўлена ў рэгістрацыі;
11. 1-7 красавіка 2026 года перыяд для абскарджання рашэння Выбарчай камісіі аб пераліку зарэгістраваных Выбарчых суб’ектаў (працягласць перыяду для абскарджання залежыць ад даты прынящця Камісіяй адпаведнага рашэння).
12. 1-10 красавіка 2026 года Камісіяй прымаецца канчатковае рашэнне аб зацвярджэнні пераліку зарэгістраваных Выбарчых суб’ектаў па выніку абскарджання; праводзіцца лёсаванне; на сайце КР публікуюць спісы кандыдатаў Выбарчых суб'ектаў.
13. 11-17 траўня 2026 года правядзенне галасавання.
14. 18 траўня 2026 года абвяшчэнне папярэдніх вынікаў галасавання.
15. 19-20 траўня 2026 года перыяд для абскарджання папярэдніх вынікаў галасавання.
16. 21-23 траўня 2026 года разгляд скаргаў і(або) зацвярджэнне вынікаў выбараў.